# ГОСЦІ СА ШВЕЦЫІ НА МАСТАЦКА-ГРАФІЧНЫМ ФАКУЛЬТЭЦЕ

Шведская дэлегацыя наведала мастацка-графічны факультэт нашага ўніверсітэта. Прафесары Ула Лінд і Анэта Гетлунд, а таксама мастачка, кіраўнік праекта «Гендар у візуальнай культуры» Ірына Хауска правялі для студэнтаў лекцыі, майстар-класы, воркшопы (практычныя заняткі).

Ірына Хауска навучалася спачатку ў нашым універсітэце, затым – у стакгольмскай мастацкай акадэміі.

«Гэта была мая мара – прыехаць у Віцебск і падзяліцца сваім вопытам, аб'яднаць дзве культуры, пазнаёміць беларускіх студэнтаў са шведскай сістэмай адукацыі, натхніць моладзь і ў той жа час нешта пераняць ад яе. У гэтай справе мне дапамагаюць мае выкладчыкі – прафесары. Спадзяюся, што супрацоўніцтва паміж Швецыяй і Беларуссю ў гэтай сферы будзе працягнута», – адзначыла Ірына Хауска.